# «КАЛІ БАЧЫМ РОДНЫ БЕРАГ...»

Наш каляндар

«Літаратура — гэта бурлівы і глыбокі акіян. І трэба быць добрым плыўцом, каб не ўтапіцца ў ім. А спакойна і ўпэўнена плысці можна толькі тады, калі бачым родны бераг...» —аднойчы ў размове з сябрам сказаў Мікалай Раманоўскі. Сэнс гэтых слоў зразумеў сябар, калі ў маі 1923 года прачытаў у газеце «Савецкая Беларусь» першае апавяданне Міколы Раманоўскага «На граніцы», падпісанае псеўданімам Кузьма Чорны. У ім расказваецца пра падзеі, што адбываліся на граніцы з Польшчай, якая праходзіла да 1939 года непадалёку ад Цімкавіч. Гэта апавяданне К. Чорны лічыў пачаткам сваёй сталай творчасці.

Усе найбольш значныя творы Чорнага — і апавяданні, і аповесці, і раманы, — напісаныя перад вайною і ў час вайны, цесна звязаны з той мясцінай, дзе «паблізу чутны ў людской гаворцы гарады Нясвіж і Слуцак», інакш кажучы, звязаны з Цімкавічамі, а героямі іх з'яўляюцца землякі пісьменніка.

Калі Кузьма Чорны садзіўся за пісьмовы стол, яго абступалі блізкія суседзі-цімкаўцы і проста знаёмыя людзі. З імі К. Чорны шчыра, па-сяброўску размаўляў, заядла спрачаўся, радаваўся за іх, жыў іхнімі пачуццямі, думкамі і роздумам. Знаёмыя цімкаўцы не прасіліся ў яго творы, а неяк самі асталёўваліся там, гаварылі пра сябе, выказвалі свае думкі ўголас. Вось ранняе апавяданне «Восень і радасць». Гэта слова пра маці, яе вялікае сэрца, замілаванасць да прыроды і жыцця.

Многа асабістага захавалася ў апавяданні «Хвоі гавораць». Тут ёсць нават рэальныя факты: «Мае справы такія: канчаю разам з бацькам на полі ворыва, малачу і чакаю з горада паведамлення —ці залічаны я студэнтам».

Калі з'явілася апавяданне «Брыгадзірава памылка», то ўсе цімкаўцы пазналі мясцовага брыгадзіра Кастуся і яго жонку Лізавету.

Вядома, пісьменнік ніколі не пераносіў у апавяданне бачанае і падгледжанае ў сырым выглядзе, жыццёвы матэрыял заўсёды праходзіў адпаведную творчую апрацоўку. Назіральнае вока выдатнага беларускага празаіка ўмела адбіраць з незвычайнага багацця фактаў самае характэрнае, самае істотнае і вызначальнае.

Рэальныя факты і падзеі, назіранні і ўражанні так узбагачаліся пісьменнікам —выдатным знаўцам чалавечай душы, а рысы многіх прататыпаў так пераўтвараліся і зліваліся ў адзінае цэлае, што станавілася пад пяром мастака глыбокім роздумам над жыццём, лёсам народа і краіны. У гэтым сэнсе вельмі цікавая перадгісторыя падзеі, з якіх выраслі два раманы Кузьмы Чорнага — «Трэцяе пакаленне» і «Вялікі дзень».

Пісьменнік лічыў сваім абавязкам кожны год пабываць у родным мястэчку, паслухаць цімкаўскія навіны. Кузьму Чорнаму хацелася некалькі дзён падыхаць цімкаўскім паветрам, пагаварыць са знаёмымі людзьмі.

«Мне б на ўсё жыццё хапіла апісваць цімкаўцаў», —часта гаварыў К. Чорны.

І так адзін за адным з'яўляліся яго творы, у якіх жывуць з родных мясцін «...Усе дарогі, пейзажы, дрэвы, хаты, чалавечыя натуры».

*Людміла* **НІЖЭВІЧ**,
дырэктар музея К. Чорнага.